# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 24 (533) Субота, 31 жніўня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

***Па меры навуковага і тэхнічнага прагрэсу далейшае развіццё атрымае вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя, заклікаеная рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, валодаючых шырокім тэарэтычным і палітычным кругаглядам.***

(З Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза).

## Найлепшых пажаданняў табе, першакурснік!

1-е верасня. Гэты дзень становіцца памятным не толькі для тых, хто ўпершыню ў жыцці пераступае парог школы. Ён застаецца памятным і для цябе, першакурснік, таму што перад табою адчыняецца новая старонка ў тваім жыцці.

Перад табою пяць студэнцкіх гадоў. Гэта свет кніг, гэта гады пазнання таямніц сваёй прафесіі, гэта гады спрэчак да раніцы, гады вясёлых, заўзятых студэнцкіх песен.

Пяць разоў ты будзеш пачынаць вучобу ў гэты дзень. Пяць гадоў наперадзе. Толькі не думай, што гэта многа. Наадварот, зусім мала. Студэнцкія гады пройдуць так хутка, што не заўважыш, калі надыдзе дзень атрымання дыплома.

Што ж пажадаць табе, сябра? Што параіць? Памятай, што універсітэт дасць табе столькі ведаў, сколькі ты возьмеш сам. Цяпер усе твае думкі павінны накіроўвацца да вучобы; з ёй сапраўды нішто не можа параўнацца. Нават адзін-адзіны дзень, праведзены не дарэмна,— гэта ўжо набыццё назаўсёды.

Пяцьсот выпускнікоў пакінулі сцены нашага універсітэта сёлета. Сярод іх — сотні выдатнікаў вучобы, актыўных грамадскіх работнікаў. Вельмі хацелася б, каб эстафету добрых спраў нашых выпускнікоў, нашых старшакурснікаў кожны з тысячы юнакоў і дзяўчат, якія паступілі сёлета ў БДУ імя У. І. Леніна, пранёс праз усе свае пяць студэнцкіх гадоў.

Для паспяховай вучобы ў нас ёсць усе ўмовы: аўдыторыі, кабінеты, лабараторыі, чытальныя залы, бібліятэка. Для адпачынку — актавая зала, спартыўныя залы. Дарэчы, цяпер сіламі студэнтаў вядзецца будаўніцтва свайго, універсітэцкага стадыёна. Горад, у якім ты вучышся, дае ўсе магчымасці для таго, каб ты мог з карысцю правесці вольны час. Узбагачай свой розум, загартоўвай сваё цела, рыхтуй сябе да будучай працоўнай дзейнасці.

Горача віншую кожнага, хто сёння заслужыў ганаровае званне студэнта! Вялікіх табе поспехаў, сябра!

**Георгій РЫЛЮК,**
сакратар камітэта ЛКСМБ БДУ імя У. І. Леніна

## БДУ ў лічбах і фактах

* * *

Сёлета 2250 студэнтаў упершыню пачынаюць вучобу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, з іх на стацыянары — 1075 чалавек, на вячэрнім аддзяленні — 475, на завочным — 700. Усяго ў 1963/64 навучальным годзе ў нашым універсітэце з адрывам і без адрыву ад вытворчасці будуць атрымліваць веды 10200 студэнтаў.

* * *

З 1944 па 1963 год уключна Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна даў краіне амаль 6700 спецыялістаў народнай гаспадаркі і культуры.

* * *

Заняткі ў Беларускім дзярж. універсітэце праводзяцца ў пяці вучэбных карпусах. Галоўны вучэбны корпус пабудаваны ў 1961 годзе і з'яўляецца другім па велічыні ў горадзе Мінску пасля будынку Дома ўрада. Агульная кубатура галоўнага корпуса — больш 110 тысяч кубічных метраў, агульная карысная плошча — звыш 20 тысяч квадратных метраў, у тым ліку вучэбная — 9500 квадратных метраў. У галоўным корпусе размяшчаюцца усе адміністратыўныя памяшканні, фізічны, матэматычны, гістарычны факультэты, вылічальны цэнтр, бібліятэка з 4 чытальнымі заламі, актавая зала на 1060 месц, спартыўная зала.

* * *

БДУ мае чатыры добраўпарадкаваныя студэнцкія інтэрнаты. Будуюцца яшчэ два жылыя карпусы для студэнтаў і сталоўка. Сіламі студэнтаў будуецца універсітэцкі стадыён.

## ВІНШУЮ!

Дарагія першакурснікі! З пачаткам верасня вы ўпершыню адчыніце дзверы аўдыторыі, каб праслухаць першую ў жыцці лекцыю ў вышэйшай навучальнай установе. Яна будзе для вас і прыадчыненай заслонай, якая пачынае шлях да пазнання культурных багаццяў свету. Ва універсітэце вы зможаце ў меру сваіх сіл вывучаць скарбонку навукі, створаную народамі свету за тысячагоддзі.

Віншую вас ад усёй душы з наступленнем навучальнага года, жадаю вам вялікіх-вялікіх поспехаў у вашай вучобе. Шчаслівай, паспяховай вучобы вам, сябры!

**Іван КОШМАН,**
студэнт 5 курса аддз. журналістыкі.



Галоўны корпус БДУ імя У. І. Леніна.

# Жыць па новых традыцыях

## Нататкі аб рабоце СНТ

**Сёння мы працягваем размову аб рабоце студэнцкага навуковага таварыства нашага універсітэта, пачатую ў канцы мінулага навучальнага года. Запрашаем студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў прыняць актыўны ўдзел у абмеркаванні гэтага пытання. Адначасова паведамляем, што ў пачатку кастрычніка рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» плануе арганізаваць сустрэчу студэнтаў універсітэта, якія пабывалі на навуковых канферэнцыях у іншых вышэйшых навучальных установах краіны.**

Колькі добрых слоў і пажаданняў было сказана аб рабоце студэнцкага навуковага таварыства універсітэта! Колькі прынята было рашэнняў на пасяджэннях Савета СНТ! Але, мне здаецца, забылі аб адным — аб тым, што рашэнні трэба выконваць. Жадаемае ж — яшчэ не сапраўднае.

Мы ведаем, што камсамольская арганізацыя універсітэта моцная і аўтарытэтная. А вось Савету СНТ, падшэфнаму камсамола, яшчэ далёка да такой ацэнкі.

Праблемы студэнцкай навуковай работы сталі ў парадак дня, яны хвалююць, заклікаюць падумаць аб тым, што трэба зрабіць для таго, каб ажывіць гэтую работу, узняць яе на больш высокі ўзровень.

У 19-м нумары газеты «Беларускі універсітэт» было надрукавана выступленне студэнта былога 3 курса гістарычнага факультэта В. Насцюшонка, у якім ён выказаў шмат правільных думак і крытычных заўваг аб рабоце СНТ. Тут жа ён скарддзіцца на дрэннае правядзенне студэнцкіх навуковых канферэнцый.

Вядома ж, у нас, ва універсітэце не вельмі даўно сталі сур'ёзна адносіцца да студэнцкай навуковай работы, яшчэ мала ў Савет СНТ паступае прапаноў па паляпшэнню і ажыўленню работы. Пасіўнасць, безыніцыятыўнасць часам пануюць у навуковых гуртках СНТ факультэтаў. Бадзёрасць, ініцыятыва, кіпенне патрэбны ў нашай рабоце. Нам неабходна стварэць новыя традыцыі і жыць па іх. Агульны ўздым навуковай работы студэнтаў залежыць не толькі ад Савета СНТ універсітэта, але і ад дапамогі ўсіх: камітэта камсамола, парткома, рэктарата, усяго шматтысячнага калектыву студэнтаў.

Чаму б нам не пераняць традыцыі і вопыт у нашых калег з Прыбалтыкі, Украіны, Ленінграда, Масквы?

Сёлета я быў на XVI студэнцкай навуковай канферэнцыі Латвійскага дзяржаўнага універсітэта імя П. Стучкі (Рыга). Мне вельмі спадабалася арганізацыя гэтай канферэнцыі. Напярэдадні была надрукавана на ратапрынце і распаўсюджана праграма канферэнцыі на рускай і латышскай мовах, зразумела, не без дапамогі рэктарата. Гавораць жа, што ў былыя часы праграмы нашых канферэнцый друкаваліся нават у друкарнях.

Праграма расказвала аб парадку работы ўсіх секцый: фізіка-матэматычнай, прыродазнаўчай, гуманітарнай. У першы дзень адбылося ўрачыстае адкрыццё канферэнцыі на агульным плянарным пасяджэнні. Колькі радасці было ў прысутных, калі кожны з гасцей вітаў гаспадароў на сваёй роднай мове! Беларусы, эстонцы, украінцы, руская, грузіны, латышы — іх усіх аб'ядняла мова дружбы і навукі.

На агульным плянарным пасяджэнні таксама былі заслуханы даклады гуманітарыяў і эканамістаў, якія маюць найбольш актуальнае гучанне. На другі дзень пачалася работа секцый па профілях.

У канцы канферэнцыі было праведзена ўрачыстае закрыццё яе з аб'яўленнем вынікаў і ўзнагароджаннем гасцей. Пасля афіцыяльнай часткі адбыўся вялікі канцэрт з удзелам студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рыгі. Радаснае свята студэнцкіх навуковых таварыстваў закончылася танцамі.

У сапраўднае светлае свята пачынаючых даследнікаў і маладых вучоных вылілася гэтая канферэнцыя. Рыга пакінула ў маёй душы памяць аб сваіх музеях, помніках, новабудоўлях, а галоўнае — аб вясёлых і жыццёрадасных студэнтах.

Мне здаецца, што вельмі дарэчы было б правядзенне сустрэчы ўсіх студэнтаў, якія пабывалі на канферэнцыях у іншых універсітэтах, з мэтай зборы і абагульнення вопыту студэнцкай навуковай работы.

Кожны новы дзень набліжае нас да навуковай студэнцкай канферэнцыі. Яна пачынаецца сёння, яна — у кожным радку навуковага даследавання, у кожным эксперыменце, формуле, вываду.

На добры ўспамін рыжане падарылі мне зборнік студэнцкіх работ. І я маю мару, што ў гэтым навучальным годзе падару студэнтам з Рыгі зборнік работ студэнтаў нашага універсітэта. А мара ж—спраба добрая!

**Генадзь ПАЛЬЦАЎ,**

старшыня СНТ філалагічнага факультэта, намеснік старшыні Савета СНТ універсітэта па гуманітарных факультэтах, студэнт 3 курса аддзялення рускай мовы і літаратуры.

### ЭМІЛЬ КРОТКІ

### Урыўкі з ненапісанага

*Собаль ідзе на каўняры, але неахвотна.*

* * *

*Добрае апавяданне павінна быць кароткім, дрэннае—яшчэ карацей.*

* * *

*Калі ты не змог знайсці сябе, то як жа цябе знойдуць іншыя?*

* * *

*Колькі часу ні губляеш, а гадоў усё прыбаўляецца.*

* * *

*Ніколі ў жыцці не сядзеў за сталом, заўсёды засядаў за ім.*

* * *

*Рэдактар быў паэт і чужых вершаў не друкаваў толькі ў двух выпадках: калі яны яму не падабаліся або вельмі падабаліся.*

### Нарочно не придумаешь...

*(Из ответов абитуриентов на экзаменах по русскому языку и литературе).*

Салтыков-Щедрин работал в журнале «Записки охотника».

* * *

Константин Федин написал роман «Бруски».

□

*(Из сочинений по русскому языку).*

Кирсанов был для него тем, чем Лопухов был для Веры Павловны.

* * *

«Нет уз сильнее товарищества», — говорил Тарас Бульба словами Гоголя.

* * *

Претворяя в жизнь линию партии во главе с Давыдовым.

## *Крыху аб мастацтве*

# Аркестровыя мініятуры А. К. Лядава

Праграмныя аркестровыя мініятуры А. К. Лядава створаны ў лепшы час яго творчасці. У іх ярка праявілася такая ўласцівая Лядаву паэтычная ўлюбёнасць у стыхію рускай народнай фантастыкі. Чароўныя вобразы прыроды, чарадзейнае царства казкі, населенае цудоўнымі істотамі, перададзены Лядавым з непаўторнай тонкасцю, зграбнасцю, маляўнічасцю.

«Баба-Яга» — сімфанічная карціна для вялікага аркестра. З першых фантастычных гукаў музыкі вы трапляеце ў свет рускай казкі. У змрочным гучанні фагота вырысоўваецца вычварнае аблічча Бабы-Ягі, якая накіроўваецца ў шлях.

Далей музыка малюе імклівы палёт Бабы-Ягі, які суправаджаецца шумам і трэскам дрэў, хрустам сухога лісця, устрывожаным шчабятаннем птушак. Заключныя акорды флейт малююць аддаленне злавеснай Бабы-Ягі.

«Чарадзейнае возера» — казачная карціна для аркестра. Праграмы гэтага твору Лядаў не пакінуў. Але, слухаючы яго музыку, мы нібы адчуваем рэальныя ўражанні, пачэрпнутыя кампазітарам у зносінах з роднай прыродай. «Вось як было ў мяне з возерам, — расказвае Лядаў. — Ведаў я адно такое, — ну, простае лясное рускае возера і ў сваёй непрыкметнасці і цішыні асабліва прыгожае». Матыў двух габоеў можна разгледжваць як вядучы меладычны вобраз твору. Кампазітар імкнецца перадаць адчуванне згубленага ў лясной глушы возера. У дасягненні гэтай мэты кампазітар выказвае невычэрпную вынаходлівасць.

**Олег ВЕНГЕРЕНКО,**
**студэнт-журналіст,**
**слесарь моторного завода**

**СТИХИ ПЕРВОКУРСНИКОВ**

### Силу людей никому не измерить...

*Если руки устали,*
*Если ноги устали,*
*Если слабость*
*Соленое тело сосёт,*
*Вспомни ты,*
*Что деталь из железа и стали*
*Точно так же*
*В тяжёлом труде устаёт.*
*Назовут тебе цифры,*
*Покажут примеры,*
*Да любой инженер*
*Тот вопрос разрешит,*
*Только силу людей*
*Никому не измерить*
*Даже с помощью*
*Самых разумных машин.*

*

**СКАЖУЦЬ ЖА ТАКОЕ!**

Ён пабываў у сваіх падшэфных усяго адзін раз, а можа і таго менш.

(З выступлення на сходзе).
Запісаў **В. НАЛІМАЎ**

# Правілы карыстання бібліятэкай БДУ імя У. І. Леніна

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Права карыстання бібліятэкай прадастаўляецца прафесарска-выкладчыцкаму саставу, аспірантам, студэнтам дзённага, вячэрняга і завочнага навучання, рабочым і служачым універсітэта, студэнтам, аспірантам, навуковым работнікам іншых навучальных устаноў, а таксама спецыялістам народнай гаспадаркі і культуры.

Чытачу бібліятэкі прадастаўляюцца ў карыстанне кнігі, часопісы, газеты і іншыя матэрыялы, якія маюцца ў ёй. Выдаецца літаратура ў чытальных залах і на абанеменце. Выданні, якіх няма ў бібліятэцы, па просьбе чытачоў выпісваюцца з іншых бібліятэк для карыстання ў чытальных залах.

Чытачу аказваецца ўсебаковая дапамога ў падборы літаратуры і набыцці навыкаў карыстання даведнікамі і каталогамі.

Запіс чытачоў праводзіцца пры прад'яўленні пашпарта і студэнцкага або аспіранцкага білета, службовага пасведчання, на падставе якіх бібліятэка выдае пастаянны адзіны білет чытача або ставіць узамен білета нумар чытача ў студэнцкім білеце або службовым пасведчанні. Бібліятэка БДУ штогод праводзіць перарэгістрацыю чытачоў. Пры перарэгістрацыі чытач павінен здаць для ўліку літаратуру, якая лічыцца за ім і якую ён можа атрымаць зноў пасля перарэгістрацыі. Чытачы, якія не прайшлі перарэгістрацыю, бібліятэкай не абслугоўваюцца.

Студэнты і аспіранты перад уходам на летнія канікулы павінны здаць усе кнігі, якія лічацца за імі.

Аб змяненні месца работы, вучобы або адраса чытач павінен паведаміць у бібліятэку ў 10-дзённы тэрмін.

### II. ПАРАДАК КАРЫСТАННЯ ЛІТАРАТУРАЙ

**а) На абанеменце**

Навуковая літаратура выдаецца чытачам на тэрмін да 2 месяцаў у наступнай колькасці: прафесарам, выкладчыкам, навуковым супрацоўнікам і аспірантам — да 15 тамоў, студэнтам старэйшых курсаў—да 5 тамоў, астатнім чытачам — да 3 тамоў, членам СНТ і дыпломнікам — да 5 тамоў дадаткова.

Вучэбная літаратура выдаецца ў колькасці да 10 кніг на адзін семестр. Палітычная літаратура выдаецца без абмежавання.

Перыядычныя выданні выдаюцца на тэрмін да 15 дзён у колькасці не больш 5 тамоў або аднаго збрашураванага гадавога камплекта. Перыядычныя выданні за бягучы год выдаюцца толькі ў чытальных залах.

Мастацкая літаратура выдаецца на тэрмін да 15 дзён у колькасці не больш 2 кніг.

Тэрмін карыстання кнігай можа быць падоўжаны пры ўзгадненні з работнікамі абанемента.

Для студэнтаў-завочнікаў тэрміны карыстання падручнікамі ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад тэрмінаў правядзення лабараторна-экзаменацыйных сесій.

Не выдаецца на дом рэдкія, каштоўныя і рукапісныя выданні, дысертацыі, аўтарэфераты, рэфератыўныя часопісы, газеты, а таксама кнігі, атрыманыя па міжбібліятэчнаму абанементу.

У выпадку затрымкі кніг звыш устаноўленага тэрміну без уважлівых прычын чытач пазбаўляецца права карыстання бібліятэкай на 1—2 месяцы.

Па міжбібліятэчнаму абанементу літаратура выдаецца абанентам на адзін месяц.

**б) У чытальных залах**

Кнігі з дапаможных фондаў чытальных залаў кнігасховішчаў выдаюцца па вуснаму патрабаванню або па патрабавальным лісткам.

Выносіць кнігі з чытальнай залы не дазваляецца. Выходзячы з чытальнай залы на працяглы час, чытач павінен здаць кнігі дзяжурнаму бібліятэкару.

Кнігі з кабінетаў і лабараторый на дом не выдаюцца.

## Фізкультура і спорт

# Спартсмены БДУ на III Спартакіядзе народаў СССР

У саставе зборнай каманды Беларускай ССР на III Спартакіядзе народаў СССР былі і спартсмены нашага універсітэта. Многія з іх паказалі высокія вынікі.

Найбольшага поспеху дасягнуў аспірант хімічнага факультэта Уладзімір Гараеў. Ён заваяваў першынство спартакіяды ў трайным прыжку і атрымаў залатны медаль. Вынік Гараева — 16 метраў 34 сантыметры.

Парадавалі высокімі вынікамі плыўцы — спартсмены БДУ. Яўген Емяльянаў у папярэднім заплыве на 200 метраў батэрфляем устанавіў новы рэкорд рэспублікі — 2 мінуты 26,2 секунды. У фінале комплексага плавання на 400 метраў ён паказаў вынік 5 мінут 11,7 секунды. Гэта таксама рэкорд Беларусі. Уладзімір Бандарэнка ўстанавіў новы рэкорд рэспублікі ў плаванні на 200 метраў на спіне — 2 мінуты 24,0 секунды.

Вельмі ўдала выступіў веласіпедыст Васіль Луцкін. У спрынтэрскай гонцы ён выканаў нарматыў майстра спорту.

**Рэдактар У. КУЛАЖАНКА**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 10435 Тыр. 2000 Зак. 3078.